Весці БДПУ. Серыя 1. 2019. № 4. С. 32–35

УДК 378.091.2:39

# ПОЛІМАСТАЦКАЕ РАЗВІЦЦЁ СТУДЭНТАЎ У ПРАЦЭСЕ ТВОРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў ФАЛЬКЛОРНЫМ АНСАМБЛІ

**А. М. Шугаеў,**
*дацэнт кафедры музычна-педагагічнай адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка*

Паступіў у рэдакцыю 12.11.19.

UDC 378.091.2:39

# POLYARTISTIC DEVELOPMENT OF STUDENTS IN THE PROCESS OF CREATIVE ACTIVITY IN A FOLKLORE ENSEMBLE

**A. Shugaeu,**
*Associate Professor of the Department of Musical-Pedagogical Education of Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank*

Received on 12.11.19.

У артыкуле даследуецца полімастацкае развіццё студэнтаў у працэсе творчай дзейнасці ў фальклорным ансамблі на прыкладзе дзейнасці вядучага творчага калектыву ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» народнага ансамбля беларускай музыкі і песні «Ярыца». Аналізуюцца асаблівасці полімастацкага асяроддзя, у якім адбываецца фарміраванне прафесійных навыкаў студэнтаў спецыяльнасцей эстэтычнага напрамку (будучых настаўнікаў музыкі, рытмікі і харэаграфіі, сусветнай і айчыннай культуры, выяўленчага мастацтва, педагогаў дадатковай адукацыі).

*Ключавыя словы*: полімастацкае развіццё, творчая дзейнасць, фальклорны ансамбль, эстэтычная адукацыя, фальклор, народны ансамбль беларускай музыкі і песні «Ярыца».

The article investigates the polyartistic development of students in the process of creative activity in the folklore ensemble on the example of the leading creative team of the educational institution “Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank” of the national ensemble of Belarusian music and song “Yarytsa”. The article analyzes the features of the polyartistic environment in which the formation of professional skills of students of specialties of aesthetic direction (future teachers of music, rhythm and choreography, world and domestic culture, fine arts, teachers of additional education) takes place.

*Keywords:* polyartistic development, creative activity, folklore ensemble, aesthetic education, folklore, folk ensemble of Belarusian music and songs «Yarytsa».

Адным з важнейшых элементаў культуры з’яўляецца сістэма адукацыі. Яна выконвае ў грамадстве многія функцыі, адна з якіх – захаванне і развіццё нацыянальных традыцый, адметных і значных элементаў народнай культуры.

Трансфармацыя гісторыка-культурнай сітуацыі ў нашай рэспубліцы, у сусветным грамадстве актуалізуе перад сістэмай адукацыі новыя задачы. Іх трэба будзе вырашаць будучым педагогам – сённяшнім студэнтам. Па гэтай прычыне настолькі важна, каб яны былі значнымі як носьбіты нацыянальнай і сусветнай культуры, валодалі якасцямі сучаснай глыбока развітай асобы.

Працэс творчай дзейнасці ў фальклорным ансамблі ўключае ў сябе цэлую сістэму дзеянняў, псіхічных працэсаў, эстэтычных перажыванняў. Адбываецца развіццё навыкаў успрымання розных відаў мастацтва, а затым – авалодвання іх асновамі, прынцыпамі функцыянавання.

Творчая дзейнасць студэнтаў у фальклорным ансамблі адначасова з’яўляецца:

- **вынікам** працэсу развіцця навыкаў, ведаў, якасцяў, неабходных для ўдзельніка ансамбля, якія праяўляюцца ў сцэнічнай дзейнасці, у выступленнях на конкурсах і фестывалях;
- **сродкам** полімастацкага развіцця моладзі.

Шматлікімі даследчыкамі даказана, што ў фарміраванні творчай дзейнасці і творчага мыслення важна развіццё пачуццёва-эмацыянальнай сферы, уяўлення, фантазіі. Пра розныя аспекты гэтага пісалі Л. С. Выгоцкі, А. І. Савенкоў, В. С. Юркевіч і інш.

Б. М. Неменскі пераканаўча падкрэсліваў, што розныя віды мастацтва «хаваюць у сябе асаблівыя магчымасці для развіцця творчай патэнцыі, фантазіі і інтуіцыі» [1, с. 40]. Вучоны бачыў непасрэдную сувязь паміж логіка-навуковым і эмацыйна-мастацкім пачаткамі. Ён лічыў, што развіццё творчых здольнасцей варта пачынаць з успрыняцца твораў мастацтва [1].

Полімастацкае развіццё – гэта асобасна арыентаванае планамернае прыцягненне асобы да розных відаў мастацтваў у іх узаемадзеянні, вынікам якога з’яўляецца фарміраванне комплексу эстэтычных уласцівасцяў асобы, полімастацкай свядомасці і здольнасці да полімастацкай дзейнасці, якія забяспечваюць гатоўнасць да мастацка-творчай самарэалізацыі і мастацка-эстэтычнага самаўдасканалення.

Сутнасць працы фальклорнага калектыва грунтуецца на эфектыўным спалучэнні розных формаў, традыцыйных і інавацыйных метадаў і прыёмаў, на даступнасці і мэтазгоднасці прапанаванага мастацкага матэрыялу, на стварэнні ў ансамблі ўмоў, якія будуць спрыяць іх полімастацкаму развіццю.

Належная ўвага ў пачатку працы заўсёды надаецца асяроддзю, у якім развіваецца член фальклорнага калектыву. Атмасфера, якая спалучае навучальны працэс з творчасцю, мае інтэграваную прыроду. Яна дазваляе максімальна развіваць у студэнтаў аб’ём ведаў, а таксама вобразных уяўленняў, фантазію, якія з пункту гледжання тэорыі «полімастацкага развіцця» Б. П. Юсава [2] з’яўляюцца абавязковай умовай развіцця творчага патэнцыялу асобы. Менавіта мэтазгодна арганізаванае асяроддзе забяспечвае асноўную педагагічную ўмову – інтэграваны падыход да засваення мастацтва (у нашым выпадку – беларускага народнага музычнага мастацтва).

У працэсе працы студэнцкага фальклорнага ансамбля адбываецца складаны працэс засваення

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



*Рысунак – Народны ансамбль беларускай музыкі і песні «Ярыца»*

сістэмы народнага мастацтва [3]. І не для кожнага сучаснага маладога чалавека гэта натуральны працэс. У нашай краіне, як і ў любой іншай, гісторыка-культурная сітуацыя моцна і хутка трансфармуецца. Тое мастацтва, якое было традыцыйным і родным для соцен пакаленняў, стала не зусім сваім ці зусім не сваім.

Разгледзім сітуацыю на прыкладзе дзейнасці вядучага творчага калектыву ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» народнага ансамбля беларускай музыкі і песні «Ярыца» (рысунак).

У polімастацкім асяроддзі адбываецца фарміраванне прафесійных навыкаў у студэнтаў спецыяльнасцей эстэтычнага напрамку (будучых настаўнікаў музыкі, рытмікі і харэаграфіі, сусветнай і айчыннай культуры, выяўленчага мастацтва, педагогаў дадатковай адукацыі).

У студэнтаў нават адной спецыяльнасці на момант іх пачатку ўдзелу ў фальклорным ансамблі сфарміраваны розныя ўяўленні аб народнай песеннай, інструментальнай, харэаграфічнай, тэатральнай, дэкаратыўна-прыкладной творчасці. З дзяцінства ў іх фарміравалася пэўнае стаўленне да народнай культуры сваёй радзімы і іншых краін [4; 5]. У школе праца па знаёмстве з фальклорам вялася ў некалькіх кірунках: на ўроках музыкі, літаратуры вывучаліся народныя песні (дзіцячыя, пазаабрадавыя, каляндарна-абрадавыя), творы малых жанраў фальклору (загадкі, прыказкі і прымаўкі, лічылкі, казкі і іншыя), абрады і святы, разглядаліся некаторыя музычныя інструменты і г. д.; праводзілася гуртковая праца для дзяцей, зацікаўленых у вывучэнні фальклору; арганізоўваліся выхаваўчыя мерапрыемствы з запрашэннем фальклорных калектываў і іншае. На гэтым этапе адбывалася маральна-эстэтычнае выхаванне навучэнцаў: развіваўся іх мастацкі густ, кругагляд, дзеці атрымлівалі першыя навыкі мастацкатворчай дзейнасці.

На новы ўзровень гэтая праца выходзіць у фальклорным калектыве ва ўстанове вышэйшай адукацыі [6; 7]. Дзейнасць фальклорных калектываў у сучасным свеце не толькі ўключае ў сябе аматарскія заняткі ў сферы вольнага часу, але і ўяўляе сабой велізарную педагагічную ў сваёй аснове прафесійную працу, якая распаўсюджваецца далёка за межы традыцыйнага вольнага часу на такія сацыяльныя сферы, як прафесійная сістэма адукацыі і наступная кар'ера спецыялістаў, прафесійнае мастацтва і народная творчасць. Фальклорны калектыў заклікаааны вырашаць шэраг задач:

- вучэбныя – вывучэнне, рэканструкцыя і аднаўленне традыцыйнага фальклору пэўнай мясцовасці, павышэнне прафесійнага выканальніцкага ўзроўню ўдзельнікаў;
- навуковыя – выпрацоўка метадаў фальклорызацыі народных твораў, арганізацыя і правядзенне семінараў, канферэнцый і стажыровак, фальклорных экспедыцый;
- мастацка-творчыя – правядзенне канцэртнай дзейнасці, традыцыйных абрадаў, святаў, гулянняў.

Метады работы з фальклорным калектывам фарміруюцца пад уплывам двух асноўных фактараў: 1) вывучэнне заканамернасцей з'яў фальклору; 2) работа над удасканаленнем прафесійных здольнасцей і асабістых якасцей выканаўцаў.

У працэсе вывучэння фальклорных традыцый удзельнікі калектыву павінны авалодаць вербальнай, музычнай, харэаграфічнай і тэатральнай мовай. У сувязі з гэтым шырока павінна выкарыстоўвацца праца з першакрыніцамі – экспедыцыйныя запісы народных песень, абрадаў, архіўныя матэрыялы, па магчымасці, непасрэдныя сустрэчы з носьбітамі традыцыі. Гэта спрыяе спасціжэнню асаблівасцей традыцыйнага гучання, успрыманню асаблівасцей перадачы гуку і руху, выяўленню нюансаў пластыкі, «мовы» жэстаў і іншага. Для эфектыўнай работы з музычна-выканальніцкімі заканамернасцямі дыялектнай мовы варта выкарыстоўваць запісы размоў носьбітаў традыцыі, празаічныя жанры фальклору, а таксама вывучэнне ўсіх магчымых варыянтаў песні.

Адным з важных прынцыпаў арганізацыі работы са студэнтамі ў калектыве з'яўляецца індывідуальны падыход. Для актывізацыі творчага працэсу і прываблівання ўдзельнікаў у калектыў кіраўнік павінен улічваць індывідуальныя здольнасці і магчымасці кожнага, імкнуцца дапамагчы кожнай асобе знайсці сваю «нішу» ў калектыве і творчасці, праявіць ініцыятыву. З мэтай арганізацыі калектыўнай творчасці ён можа шырока выкарыстоўваць шлях прыцягнення да розных відаў мастацкай дзейнасці, што таксама садзейнічае выхаванню духоўна маральнай асобы. Спецыфікай студэнцкіх калектываў з'яўляецца тое, што ўдзельнікі прыходзяць з рознай ступенню падрыхтоўкі, рознымі матывамі і мэтамі. Для таго

РЭПОЗІТОРЫЙ БДПУ

каб калектыў выйшаў на прафесійны ўзровень, кіраўнік першапачаткова павінен выявіць патэнцыяльныя выканаўча-творчыя магчымасці кожнага з удзельнікаў. Арганізаваць рэпетыцыйны працэс неабходна такім чынам, каб кожны мог праявіць свае здольнасці. Для гэтага магчыма выкарыстоўваць сольныя спевы і выкананне, спевы невялікімі групамі, калі дакладна можна пачуць кожнага выканаўцу, калі кожны «трэніруе» не толькі свае выканальніцкія магчымасці, але і набывае псіхалагічную ўпэўненасць, здымае заціснутасць і комплексы.

У выканаўчым працэсе неабходна забяспечыць актыўную ролю кожнага, стварыць умовы для раскрыцця здольнасцей усіх удзельнікаў. Яны павінны разумець, што кожны з іх ёсць раўнапраўны «стваральнік» выступлення, ад іх у аднолькавай меры залежыць якасць выканання, калектыўнае гучанне, ансамблевая палітра. Удзел у фальклорным ансамблі – гэта не толькі калектыўная творчасць [8; 9], але і арганічнае спалучэнне індывідуальнасцей, уменне падпарадкаваць свой голас агульнаму гучанню, агульнаму руху, агульнаму дзеянню.

Сцэнічнае выкананне фальклорных твораў заўсёды звязана з пэўнымі цяжкасцямі, якія ўзнікаюць па прычыне адарванасці сцэнічнага варыянта ад сапраўднага асяроддзя, дзе гэтыя творы нарадзіліся і развіваліся. У сувязі з гэтым мастацкі кіраўнік можа выкарыстоўваць законы драматычнага мастацтва пры пастаноўцы сцэнічных нумароў. Сцэнічнае ўвасабленне традыцыйных абрадаў прадугледжвае злучэнне розных відаў народнага мастацтва (песня, танец, драматызаванае дзеянне) у адзінае дзейства праз сістэму выразных сродкаў тэатральнага мастацтва. Такім чынам, перад кіраўніком стаяць як рэжысёрскія задачы, так і хормайстарскія, і веданне законаў тэатралізацыі, сцэнаграфіі і іншае. Паколькі фальклор у натуральным бытаванні меў сінкрэтычны характар, то ў сцэнічным увасабленні фальклорная з'ява павінна быць перададзена ва ўстаноўленым традыцыяй кантэксце. Гэта патрабуе ад кіраўніка калектыву вывучэння і асэнсавання функцыянальных, змястоўных і сэнсавых асаблівасцей фальклорных твораў, пошуку эфектыўных сродкаў і метадаў перанясення музычнага твора з бытавых умоў на сцэну з мінімальнымі стратамі. Згодна з народнай традыцыяй песня не існавала асобна, яна суправаджалася рухамі, жэстамі, імправізацыяй. Спявак дзейнічаў у песні, ён з'яўляўся актыўным удзельнікам дзеяння, заключанага ў ёй. З мэтай дасягнення сапраўднасці свайго выканання, адпаведнасці традыцыі калектыў павінен імкнуцца да рэалізацыі фальклорных узораў у натуральным асяроддзі: напрыклад, праводзіць калядаванне ў той установе, дзе працуе, выступаць на кірмашах і масавых гуляннях і г. д. Гэта дазволіць набыць вопыт непасрэдных зносін удзельнікаў калектыву з гледачамі і напоўніць выкананне эмацыянальнасцю, што даволі часта губляецца на сцэне.

Працуючы над музычна-паэтычным творам, кіраўнік павінен звярнуць асаблівую ўвагу на разуменне ўдзельнікамі калектыву мастацкага вобраза твора [9]. У кожным асобным жанры раскрываецца шэраг вызначаных тэм. Гэта пачуцці і перажыванні чалавека, апавяданні пра гістарычныя падзеі, казачныя гісторыі, жыццёвыя сітуацыі, адносіны паміж людзьмі і г. д. Для таго каб зразумець асноўную ідэю песні, неабходна правесці аналітычную работу з музычным і паэтычным тэкстам. Ідэя песні не заўсёды захавана ў словах, яна выяўляецца ў мелодыі, ладзе, гармоніі. З ідэяй твора цесна звязана вызначэнне часу і месца дзеяння, сацыяльныя ўмовы бытавання песні, яе рэгіянальная прыналежнасць. Разуменне галоўнай ідэі патрэбна для таго, каб выканаўцы ведалі, чаму калектыў выконвае менавіта гэтую песню ў дадзенай праграме, якія пачуцці павінна яна выклікаць у слухача.

Важнае значэнне ў рабоце з удзельнікамі фальклорнага калектыву мае фарміраванне ўмення рухацца на сцэне, вывучэнне народнай пластыкі, традыцыйнай харэаграфічнай мовы. На хвалі цікаўнасці да этнаграфіі сёння фарміруецца прынцыпова новае стаўленне да народнага танца. Зварот да фальклору арганічна стаў выхадам з крызіснай культурнай сітуацыі. Пакуль яшчэ ёсць магчымасць паўдзельнічаць у палявых экспедыцыях, наладзіць стасункі з вясковымі жыхарамі, павучыцца традыцыйным танцам на вясковых вечарынах з бабулямі і дзядулямі, знайсці аўтэнтычных музыкаў. Народная харэаграфія стала аб'ектам увагі фалькларыстаў-практыкаў, этнахарэографаў (у Беларусі – С. Г. Выскварка, М. А. Козенка і інш.) і даследуецца як неад'емная, вартая вывучэння частка традыцыйнай народнай культуры. Танец у спецыфічнай форме канцэнтруе ў сабе разнастайныя моманты жыццядзейнасці чалавека і, разам з тым, рэчаіснасць, якую ён адлюстроўвае. Праз навучанне народным танцам раскрываецца душа, менталітэт нацыі. У пластычных вобразах адлюстроўваюцца арыгінальнасць мастацкага мыслення народа, характэрныя рысы ментальнасці, асаблівасці светапогляду. Спецыфіка тэхнікі выканання традыцыйных беларускіх народных танцаў ва ўмовах сцэнічнага выступлення базіруецца на пераемнасці і трансфармацыі вясковай, так званай каранёвай танцавальнай культуры. Адным з важных прынцыпаў з'яўляецца жывое навучанне народным танцам. Народны танец не можа разглядацца ў ізаляцыі, самастойнасці, без кантэксту ў межах народнай культуры. Ён шмат у чым вызначаецца асяроддзем, у якім развіваецца танцавальная культура, і светаадчуваннем яго носьбітаў.

Вызначэнне і засваенне рэгіянальных асаблівасцей фальклорных твораў павінна выклікаць асаблівую ўвагу з боку кіраўніка калектыву. Адрозненне фальклорных традыцый датычыцца характару вымаўлення, рытмікі, інтанацыйнага строю, спалучэння з харэаграфічнымі элементамі. Дзеля набліжэння да аўтэнтычнага выканання кіраўнік павінен арганізаваць работу над засваеннем асаблівасцяў паэтычнага дыялекту і музычных заканамернасцяў фальклорных твораў. Важнае месца ў навучальным працэсе займаюць метады назірання за работай галасавога апарату, дакладнага капіравання кіраўніка падчас правядзення разнастайных практыкаванняў, выпрацоўкі артыкуляцыйнай тэхнікі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тэмброўкі голасу, адметных спосабаў гуказдабывання.

Асаблівае значэнне для кіраўніка калектыву мае складанне рэпертуару, гэта заўсёды вострая практычная праблема. Адбор фальклорных твораў з’яўляецца творчым працэсам, заснаваным на выдатнай прафесійнай падрыхтоўцы кіраўніка. Ён павінен улічваць шмат момантаў: законы ўспрымання музычнага матэрыялу, магчымасці кожнага выканаўцы і калектыву ў цэлым, спецыфіку спалучэння розных твораў у адной праграме і інш. Абавязковай умовай якасці рэпертуару з’яўляецца разнастайнасць тэм і жанраў фальклорнага матэрыялу. Захаванне гэтай умовы спрыяе павышэнню цікавасці і жадання да выканання песень.

Важным кампанентам для фальклорнага калектыву з’яўляецца канцэртная і гастрольная дзейнасць. Выступленні дазваляюць выявіць і прадэманстраваць магчымасці і дасягненні калектыву, маюць вялікае выхаваўчае значэнне. Акрамя гэтага сумесныя паездкі аб’ядноўваюць удзельнікаў, згуртоўваюць калектыў, садзейнічаюць станаўленню і замацаванню сяброўскіх адносін.

З мэтай удасканалення прафесійных уменняў студэнтаў неабходна планамерная вакальна-харавая работа ў спалучэнні з работай па развіцці меладычнага і гарманічнага слыху. Харавыя заняткі ўплываюць на фарміраванне гарманічна развітай асобы, паколькі фарміруюць такія якасці, як: эмацыянальнасць, камунікабельнасць, крэатыўнасць, ініцыятыўнасць, арганізаванасць, адказнасць. Развіваюцца таксама такія спецыяльныя ўменні і навыкі, як сцэнічная культура, эстэтычны густ, творчыя здольнасці, прамоўніцкае мастацтва. Харавыя заняткі спрыяюць развіццю ўспрымання, ўяўлення, мыслення, волі, увагі. Спецыфіка харавога спеву як калектыўнай формы выканальніцтва нямала спрыяе таму, каб тыя, хто не ўпэўнены ў сабе, сарамлівыя і неўпэненыя, мелі магчымасць з задавальненнем далучыць свой голас да галасоў сяброў. Пры гэтым харавы спеў мае перад сольным некалькі важных пераваг музычна-эстэтычнага і выхаваўчага парадку. Гэта перш за ўсё актыўная роля калектыўнага музіцыравання ў станаўленні індывідуальнага мастацкага густу, музычных здольнасцяў, асобасных якасцяў [3, с. 7].

Такім чынам, праблема полімастацкага развіцця з’яўляецца актуальнай у наш час. Галоўная задача – развіццё эмацыйна-пачуццёвай сферы ўдзельнікаў фальклорнага ансамбля, удасканаленне сфарміраваных выканальніцкіх навыкаў, прафесійных уменняў музыканта, фарміраванне мастацка-эстэтычнай кампетэнтнасці, творчай індывідуальнасці. Абапіраючыся на полімастацкі падыход у фарміраванні творчых здольнасцяў студэнтаў, які аб’ядноўвае розныя віды дзейнасці: музычную, харэаграфічную, гульнявую, камунікатыўную, прадуктыўную і іншыя, кіраўнік фальклорнага ансамбля павінен даць уяўленне аб спецыфіцы розных відаў мастацтва, выразных асаблівасцях іх мастацкіх сродкаў, навучыць студэнтаў бачыць фальклорны свет як адзінае цэлае, у якім усе элементы ўзаемазвязаны.


*Літаратура*

1. *Неменский, Б. М.* Мудрость красоты: о проблемах эстетического воспитания / Б. М. Неменский. – М. : Просвещение, 1981. – 192 с.
2. *Егорова, А. М.* Полихудожественный подход к организации учебного процесса в системе внеклассной работы общеобразовательной школы как средство развития музыкальной одаренности учащихся / А. М. Егорова // Проблемы и перспективы развития образования: материалы III Междунар. науч. конф. (г. Пермь, январь 2013 г.). – Пермь : Меркурий, 2013. – С. 72–74.
3. Эстэтычнае выхаванне моладзі сродкамі святаў і абрадаў [Электронны рэсурс] / Н. Гуд. – 2015. – Рэжым доступу: http://repository.buk.by:8080/xmlui/handle/123456789/7005. – Дата доступу: 20.07.2017.
4. *Болбас, В. С.* Эстэтычная педагогіка беларусаў : манаграфія / В. С. Болбас, І. С. Сычова. – Мазыр : Белы Вецер, 2011. – 197 с.
5. *Лозка, А. Ю.* Беларуская фалькларыстыка: Народная педагогіка і дзіцячы фальклор : вучэб.-метад. дапам. / А. Ю. Лозка. – Мінск : БДПУ, 2012. – 102 с.
6. *Черникова, Н. В.* Формирование эстетической культуры студентов в педагогическом вузе : методические рекомендации / Н. В. Черникова. – Минск : ИВЦ Минфина, 2010. – 38 с.
7. *Мелик-Пашаев, А. А.* Проблемы эстетического воспитания и педагогики творчества / А. А. Мелик-Пашаев // Человек в зеркале культуры и образования. – М., 1988. – С. 125.
8. *Брылин, Б. А.* Вокально-инструментальные ансамбли школьников : кн. для учителя / Б. А. Брылин. – М. : Просвещение, 1990. – 107 с.
9. *Гаўрына, Л.* Песенны фальклор як аснова духоўнага развіцця моладзі [Электронны рэсурс] / Л. Гаўрына. – 2011. – Рэжым доступу: http://repository.buk.by:8080/xmlui/handle/123456789/2967. – Дата доступу: 20.08.2017.

*References*

1. *Nemenskij, B. M.* Mudrost' krasoty: o problemah esteticheskogo vospitaniya / B. M. Nemenskij. – M. : Prosveshchenie, 1981. – 192 s.
2. *Egorova, A. M.* Polihudozhestvennyj podhod k organizacii uchebnogo processa v sisteme vneklassnoj raboty obshcheobrazovatel'noj shkoly kak sredstvo razvitiya muzykal'noj odarennosti uchashchihsya / A. M. Egorova // Problemy i perspektivy razvitiya obrazovaniya: materialy III Mezhdunar. nauch. konf. (g. Perm', yanvar' 2013 g.). – Perm' : Merkurij, 2013. – S. 72–74.
3. Estetychnae vyhavanne moladzi srodkami svyataŭ i abradaŭ [Elektronny resurs] / N. Gud. – 2015. – Rezhym dostupu: http://repository.buk.by:8080/xmlui/handle/123456789/7005. – Data dostupu: 20.07.2017.
4. *Bolbas, V. S.* Estetychnaya pedagogika belarusaŭ : managrafiya / V. S. Bolbas, I. S. Sychova. – Mazyr : Bely Vecer, 2011. – 197 s.
5. *Lozka, A. Yu.* Belaruskaya fal'klarystyka: Narodnaya pedagogika i dzicyachy fal'klor : vucheb.-metad. dapam. / A. Yu. Lozka. – Minsk : BDPU, 2012. – 102 s.
6. *Chernikova, N. V.* Formirovanie esteticheskoj kul'tury studentov v pedagogicheskom vuze : metodicheskie rekomendacii / N. V. Chernikova. – Minsk : IVC Minfina, 2010. – 38 s.
7. *Melik-Pashaev, A. A.* Problemy esteticheskogo vospitaniya i pedagogiki tvorchestva / A. A. Melik-Pashaev // Chelovek v zerkale kul'tury i obrazovaniya. – M., 1988. – S. 125.
8. *Brylin, B. A.* Vokal'no-instrumental'nye ansambli shkol'nikov : kn. dlya uchitelya / B. A. Brylin. – M. : Prosveshchenie, 1990. – 107 s.
9. *Gauryna, L.* Pesenny fal'klor yak asnova duhounaga razviccya moladzi [Elektronny resurs] / L. Gauryna. – 2011. – Rezhym dostupu: http://repository.buk.by:8080/xmlui/handle/123456789/2967. – Data dostupu: 20.08.2017.


РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ